4. *Міцкевіч, А.* Пан Тадэвуш, або Апошні наезд у Літве : шляхецкая гісторыя 1811–1812 гадоў : у 12 кн. / А. Міцкевіч ; пад рэд. У. Казберука ; перакл. Я. Семяжона. – Мінск : Маст. літ., 1985. – 399 с.

5. *Русецкая, Н.* Сямейная муза: паэзія Францішкі Уршулі Радзівіл / Н. Русецкая. – Мінск : Кнігазбор, 2006. – 212 с.

6. *Скеп'ян, А. А.* Касцюміраваныя забавы ў ВКЛ у XVI–XVII стагоддзях / А. А. Скеп'ян // Беларускі гістарычны часопіс. – 2012. – № 6. – С. 25–32.

7. *Шыдлоўскі, С. А.* Культура прывілеяванага саслоўя Беларусі: 1795–1864 гг. / С. А. Шыдлоўскі ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтв., этнаграфіі і фалькл. імя К. Крапівы. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – 167 с.

8. *Щука, О. Л.* Общественно-политическая жизнь еврейского населения в Гродно в межвоенный период / О. Л. Щука // Грамадскія рухі і палітычныя партыі ў Беларусі (апошняя чвэрць XIX – пачатак XXI ст.: республ. науч. конф. – Гродно, 2009. – С. 262–266.

# МІЖКУЛЬТУРНЫЯ КАНТАКТЫ ЯК ФАКТАР РАЗВІЦЦЯ МУЗЫЧНАГА МАСТАЦТВА БЕЛАРУСІ Ў XIX ст.

***В. У. Дадзіёмава,***
*доктар мастацтвазнаўства,*
*прафесар кафедры гісторыі музыкі і музыкальнай беларусістыкі*
*Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі*

Праблемы міжкультурных сувязяў маюць прынцыповае значэнне для вывучэння айчыннага мастацкага, у тым ліку і музычнага. Гэта натуральна, паколькі беларускія землі, што знаходзяцца ў цэнтры славянскай і еўрапейскай прасторы, спрадвеку былі шчыльна звязаны ў сваім культурным жыцці з шырокім мастацкім асяроддзем. Гэтаксама і айчыннае музычнае мастацтва XIX ст. заставалася неаддзельным складальнікам вялікага музычнага абшару.

У той час, у эпоху рамантызму, калі Беларусь існавала ў дзяржаўных межах Расійскай Імперыі, найбольш інтэнсіўны характар павінна было б набыць узаемадзеянне з рускай культурай. Аднак уся першая палова XIX ст. адзначана на Беларусі ўзмацненнем заходняга прыцягнення. Адной з яго праяў стаў адток з нашага краю на захад многіх таленавітых музыкантаў. Сярод іх Н. Орда, Ф. Міладоўскі, А. Радзівіл, М. Ельскі, С. Ма-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нюшка і інш. Апошні, дарэчы, быў настаўнікам Ц. Кюі і сябрам А. Даргамыжскага, а да ад’езду ў Варшаву спрабаваў, як вядома, уладкавацца ў Пецярбургу.

Між тым з цягам часу ўзаемадзеянне беларускай і рускай музычных культур набывае новую моц і якасць: паступова музычнае мастацтва Беларусі ўваходзіць у шырокі арэал рускай музычнай культуры, падключаючыся да тых працэсаў, якія ажыццяўляюцца ў ёй. У сваю чаргу лепшыя ўзоры рускай музыкі становяцца добра вядомымі ў Беларусі. Тут гучаць оперы рускіх майстроў (ад М. Глінкі да А. Рубінштэйна), тут гастралююць буйнейшыя расійскія музыканты (у тым ліку С. Рахманінаў).

У другой палове XIX ст. умацоўваюцца і асабістыя кантакты дзеячаў дзвюх краін. У Пецярбургу набывае аўтарытэт выдатны кампазітар, які паходзіў з Віцебшчыны, Антон Абрамовіч. У Расіі плённа працуе ўраджэнец Ліды Канстанцін Горскі, кампазітар і скрыпач-віртуоз, чыім майстэрствам захапляўся П. Чайкоўскі [1].

Самога ж П. Чайкоўскага выхоўваў вядомы музыкант-тэарэтык, кампазітар і музычны дзеяч -- ураджэнец Віцебшчыны, прадстаўнік старажытнага мясцовага роду Мікалай Іванавіч Зарэмба [2; 3]. У гісторыю рускай музыкі і музычнай думкі ўвайшло таксама раней невядомае ў беларускай гісторыі імя магіляўчаніна Віктара Антонавіча Чачота. Магчыма, ён належаў да слыннага роду Чачотаў, які даў Беларусі выдатнага пісьменніка і фалькларыста Яна Антона Чачота [4]. Вучань А. Контскага, А. Гензельта, А. Вілуана і А. Сярова, В. Чачот быў бліскучым піяністам, музычным крытыкам, публіцыстам, перакладчыкам і кампазітарам.

З культурай Расіі і Польшчы паяднана дзейнасць сусветна вядомага дырыжора, ураджэнца Гродна Валерыяна Бярдзяева, які атрымаў адукацыю ў Лейпцыгскай кансерваторыі у М. Рэгера, Х. Зіта і А. Нікіша. Яго дзейнасць у Расіі ў першай трэці XX ст. (як дырыжора Марыінскага тэатра, Ленінградскай філармоніі, Свярдлоўскага опернага тэатра) прынесла яму славу выдатнага інтэрпрэтатара рускай і заходнееўрапейскай музыкі, а далейшая праца ў Варшаве, Познані і Кракаве – не толькі як дырыжора, але і вядомага выкладчыка, прафесара вядучых кансерваторый [4].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З культурамі Расіі і Польшчы звязаны таксама Ян Карловіч – бацька знанага кампазітара Мячыслава Карловіча, выдатны этнограф, лінгвіст, гісторык, музычны дзеяч, кампазітар, музыкант-выканаўца і тэарэтык. Атрымаўшы бліскучую адукацыю ў лепшых навучальных установах Еўропы, у тым ліку Маскоўскім (а таксама Гейдэльбергскім, Берлінскім універсітэтах, Парыжскай і Брусельскай кансерваторыях), ён выкладаў у Варшаўскім музычным інстытуце не толькі камерны ансамбль, але і рускую мову, якую таксама спецыяльна даследаваў побач з польскай і беларускай [4].

У апошняй чвэрці XIX ст., як вядома, галоўнымі цэнтрамі падрыхтоўкі будучых кампазітараў сталі Рускае музычнае таварыства і Пецярбургская кансерваторыя. Менавіта тут выхоўваліся класікі беларускага музычнага мастацтва – М. Чуркін, В. Залатароў (вучні М. Рымскага-Корсакава, А. Лядава, М. Балакірава, М. Іпалітава-Іванава), а пазней і М. Аладаў [4].

Увогуле ж нам пакуль складана ўявіць, што не толькі творчая дзейнасць М. Зарэмбы, В. Чачота, М. Карловіча, М. Агінскага, А. Абрамовіча, С. Манюшкі, К. Горскага шчыльна звязана з гісторыяй рускай музычнай культуры, але і дзейнасць іншых ураджэнцаў Беларусі – ад Н. Орды і М. Ельскага да К. Марцінкевіч і Ю. Дашчынскага – таксама разгортвалася ў яе кантэксце. Таму для рэканструкцыі аб’ектыўнай і стэрэаметрычный карціны музычна-культурнага мінулага важна ўлучыць у даследчае поле ўсё кола постацей, улічыць увесь спектр сацыякультурных і мастацкіх арыенціраў.

Што тычыцца заходнееўрапейскага вектара ў міжкультурных сувязях у XIX ст., дык ён прадстаўлены многімі асобамі і падзеямі. Найбольш відавочна далейшае ўмацаванне сувязяў з польскай культурай, у якое важкі ўклад унеслі ўраджэнцы Беларусі. Сярод іх ізноў прыгадаем Я. Карловіча, які ажыццяўляў разнастайныя праекты ў Польшчы (як і ў Літве, Расіі, Украіне, Чэхіі, Германіі, ЗША) і працаваў у Варшаве [4].

Выдатным прадстаўніком славянскага мастацтва быў і яго сын, ураджэнец Беларусі Мячыслаў Карловіч, кампазітар, дырыжор, грамадскі дзеяч. Паводле прызнання кампазітара, ён назаўжды захаваў цікавасць да беларускага фальклору. Гэта знайшло ўвасабленне ў «Літоўскай рапсодыі» і сімфанічным

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

трыпціху «Адвечныя песні», якія і сёння ўваходзяць у рэпертуар беларускіх выканаўцаў [4].

З ураджэнцаў Беларусі, што набылі асаблівую вядомасць ва ўсходнееўрапейскай прасторы, перш за ўсё ў польскім, літоўскім і беларускім мастацтве, з’яўляецца С. Манюшка, выдатны кампазітар і музычны дзеяч. Сфарміраваўшыся як прафесіянал ў мінска-віленскі перыяд жыцця, ён атрымаў высокае прызнанне ў Варшаве, дзе стаўся своеасаблівым сімвалам польскай нацыянальнай музыкі [5]. Таксама яго калега і сябра Ф. Міладоўскі, ураджэнец Мінска, які паспяхова гастраліраваў, выкладаў музыку і кіраваў аркестрам графа Тышкевіча ў Чырвоным Двары (каля Коўна), у 1862 г. пераязджае ў Францыю, працуе прафесарам Вышэйшай школы Сант-Клеменса [5].

З культурай Францыі звязаў свой лёс і Н. Орда. З 1833 г. ён жыў у Парыжы, дзе ўвайшоў у кола славутых мастакоў, літаратараў і музыкантаў. Найбольш цёплыя адносіны склаліся ў яго з Ф. Шапэнам, які стаў настаўнікам, калегам і сябрам кампазітара. У Парыжы Н. Орда лічыўся вельмі аўтарытэтным музыкантам, пра што сведчыць факт запрашэння яго на пост дырэктара Італьянскай оперы [6].

Сярод музыкантаў, якія знайшлі прызнанне ў заходнееўрапейскім музычным свеце, варта ўзгадаць і Антонія Генрыка Радзівіла, славутага музыканта-аматара, мецэната, які паходзіў з Нясвіжскай галіны радзівілаўскага роду. З 1792 г. князь Антоній жыў у Германіі, дзе ў садружнасці з Ё. Гётэ напісаў оперу «Фаўст». Нягледзячы на тое, што кампазіцыя належыць пяру аматара, для свайго часу яна аказалася шмат у чым наватарскай. Пасля прэм’еры ў 1835 г., што адбылася ўжо пасля канчыны аўтара, опера з трыумфам ставілася ў тэатрах Германіі, Польшчы, Чэхіі і Англіі. Усхваляваныя водзывы аб ёй пакінулі многія выбітныя дзеячы культуры – ад Р. Шумана і Ф. Ліста да У. Адоеўскага і І. Тургенева. Твор А. Радзівіла быў, як вядома, адноўлены і ў Беларусі, на радзіме продкаў яго аўтара, а прэм’ера «Фаўста», што адбылася ў 1997 г., сталася выдатнай падзеяй у мастацкім жыцці краіны [7].

Такім чынам, у XIX ст. музычная культура Беларусі разгортвалася ў цеснай сувязі са славянскім і агульнаеўрапейскім музычным светам, шчодра даруючы яму сваіх лепшых прадстаўнікоў. Не маючы ўмоў для фарміравання ўласнай кампазітар-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

скай школы (патэнцыяльныя будаўнікі якой пакідалі радзіму), яна ўбірала ў сябе музычныя здабыткі іншых культур. Толькі наступны перыяд прынёс новыя імпульсы, жыватворныя для стварэння нацыянальнай беларускай кампазітарскай школы. Яна ж пачала свой шлях пры актыўным удзеле суседніх народаў (перш за ўсё рускага), чые дзеячы закладалі падмурак беларускага нацыянальнага музычнага мастацтва. У цэлым жа ўзаемадзеянне айчыннага і замежнага музычнага свету, больш ці менш інтэнсіўнае ды выніковае ў розныя часы, непрадказальнае ў сваёй нелінейнай дынаміцы, але няспыннае ў сваім развіцці, шмат у чым вызначыла лёс як музычнай культуры Беларусі, так і Еўропы ў цэлым.

1. *Аладова, Р.* Константин Горский и его опера «Маргер» в контексте белорусской культуры / Р. Аладова. – Минск, 2005.

2. *Алексеев-Борецкий, А. А.* Николай Иванович Заремба / А. А. Алексеев-Борецкий. – СПб., 2011.

3. *Воробьев, И. С.* Н. И. Заремба – педагог и ученый / И. С. Воробьев // Петербургская консерватория в мировом музыкальном процессе. 1862–2002. – СПб., 2002. – С. 67–169.

4. *Дадзіёмава, В.* З гісторыі беларуска-рускіх музычных сувязей (да XX ст.) / В. Дадзіёмава // Музычная культура Беларусі і свету: да 100-годдзя Л. С. Мухарынскай / склад.: Т. С. Якіменка ; Навуковыя працы Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. – Вып. 12. – Серыя 1 : Беларуская музычная культура. – Мінск, 2006. – С. 207–218.

5. *Капилов, А.* Музыкальная культура Беларуси XIX – начала XX веков / А. Капилов, Е. Ахвердова. – Минск : Ин-т соврем. зн., 2000.

6. *Несцярчук, Л.* Напалеон Орда. Шлях да Бацькаўшчыны / Л. Несцярчук. – Мінск : Маст. літ., 2009.

7. *Радзивилл, А. Х.* Гете. «Фауст»: фрагменты / А. Х. Радзивилл, либретто И. В. Гете, пер. В. Семухи. – Минск, 1997. – С. 7–29.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ